# Як я на танцавальную вечарыну завітала

***Сёлета вядомы беларускі этнахарэограф, педагог, збіральнік і даследчык беларускай танцавальнай культуры Мікола Козенка адзначыў сваё 70-годдзе. Павіншаваць юбіляра, акрамя сямейнага кола, выклікаліся калегі і каляжанкі, сябры і добрыя знаёмыя, выхаванцы і проста аматары беларускіх народных танцаў.***

Пасля перамоваў і разважанняў над падарункам, усе сышліся на думцы, што лепшым варыянтам будзе агульная танцавальная вечарына, што складаецца выключна з тых танцаў, якія Мікола Аляксеевіч уласна сабраў.

Арганізацыю мерапрыемства ўзялі на сябе калегі юбіляра: кіраўнікі фальклорных калектываў «GUDA» Алена Каліноўская і Вікторыя Міхно і кіраўніца фальклорнага калектыву «Мілавіца» Марыя Снітко. Месца, трэба адзначыць, было выбрана ўдалае: ну, дзе яшчэ лепш праводзіць вечарыну аўтэнтычных танцаў, як ні ў гістарычным цэнтры горада? Ну, хіба што толькі на гістарычнай ускраіне горада, альбо ўвогуле ў вёсцы, але мяркую, што большасць жыхароў сталіцы не падзяліла б са мной гэтую думку.



Ну што, надышоў час і мне завітаць на вечарыну! На жаль, трапіла я туды не без спазнення, але ведаеце – такое пачуццё, быццам бы ты, ідучы па вуліцы, раптам трапляеш у нейкі гістарычны фільм і адразу робішся яго персанажам. Альбо адчыняеш дзверы, а там партал у іншае стагоддзе, які цябе адразу паглынае: апынаешся ў калідоры будынка пазамінулага стагоддзя з адпаведным антуражам, свята ўжо ў самым разгары, з залы даносяцца гукі баяна і скрыпкі, вакол шмат людзей у традыцыйных строях, цалкам паглыбленых у працэс святкавання. Я нават на момант сумелася перад тым, як увайсці ў залу, але ўвайшоўшы, была адразу падхопленая кавалерам і ўцягнутая танчыць «Абэрак». Чакаць пары, шчыра кажучы, доўга не давялося! Варта адзначыць, што чакаць сваю пару не давялося б нават пры вялікім жаданні: танцораў было зашмат, і дамаў і кавалераў хапала.

Акрамя танцаў, на вечарыне была прадстаўленая калекцыя кніжных выданняў аўтарства М. Козенкі, прысвечаных беларускай традыцыйнай культуры і людзям, якія зрабілі ўнёсак у яе развіццё. Мікола Аляксеевіч распавёў пра самыя значныя са шматлікіх напісаных ім выданняў, а таксама падараваў па кнізе двум сваім выхаванцам, якія адзначалі свае народзіны ў гэты дзень, што, я ўпэўненая, было для іх прыемным сюрпрызам!

Танцавальны вечар працягнуўся невялічкім конкурсам. Усім прапанавалі станчыць «Зайца» і атрымаць за перамогу... таксама зайца, шакаладнага! Я не ўдзельнічала, але назіраць за канкурсантамі было цікава. Перамаглі адразу тры каманды «зайчыкаў»! Спадзяюся, усе засталіся задаволеныя.

Ну, і як жа без віншаванняў! Свае творчыя святочныя нумары прэзентавалі калектывы «GUDA» і «Мілавіца», а таксама выкладчыкі і студэнты кафедры этнафоназнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Па заканчэнні – традыцыйнае фота на памяць усіх удзельнікаў мерапрыемства, а пасля – урачысты рытуал падкідвання юбіляра да гары і пранясенне яго па зале на імправізаваным троне (крэсле, але ж прыгожым, стылізаваным пад антыкварыят). Добра, што дужых малайцоў для гэтай справы хапала! А яшчэ ўручэнне кветак, якія Мікола Аляксеевіч з падзякамі раздарыў удзельнікам мерапрыемства.

А скончылася ўсё, вядома ж, танцам. Атмасфера ўвогуле была проста неверагодная! Я нават забылася на час, ды на які там час – на стагоддзе, у якім знаходжуся! У гэтым стане яшчэ лунала, калі выйшла на вуліцу (гістарычны цэнтр горада гэтаму паспрыяў), узгадала толькі, калі да метро падыходзіла, бо на пачатку мінулага стагоддзя яго яшчэ не было тут!

Карацей кажучы, яшчэ не ведаю, як самому юбіляру, Міколу Аляксеевічу, а мне вечарына спадабалася.

*Лізавета РЭУТ,*
*удзельніца фальклорнага калектыву «Мілавіца»*
*ЦАДАДіМ «Ветразь»*
*г. Мінска*

## Справаздача аб дзейнасці Дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» за 2020 год